КОНТРОЛЬНЫЙ
ЭКЗЕМПЛЯР

Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка»

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Прарэктар па вучэбнай рабоце
А.В. Макоўчык
2020 г.

Рэгістрацыйны № УД-31-2-34/вуч.

# УВОДЗІНЫ Ў СЛАВЯНСКУЮ ФІЛАЛОГІЮ

Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі
па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці:

**1 – 02 03 01 Беларуская мова і літаратура**

2020 г.

2

Вучэбная праграма складзена на аснове адукацыйнага стандарта ОСВО 1-02 03 03 - 2013 установы адукацыі “Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка”, зацверджанага і ўведзенага ў дзеянне пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 30.08.2013 г. № 87 і вучэбнага плана для спецыяльнасці 1 – 02 03 01 Беларуская мова і літаратура

**СКЛАДАЛЬНІК:**

Н.У. Чайка, прафесар кафедры мовазнаўства і лінгвадыдактыкі ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка”, доктар філалагічных навук, прафесар

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**

А.С. Васілеўская, загадчык кафедры беларускага і рускага мовазнаўства, БДПУ, кандыдат філалагічных навук, дацэнт

Г.К. Чахоўскі, дацэнт кафедры беларускага мовазнаўства БДУ, кандыдат філалагічных навук, дацэнт

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**

Кафедрай мовазнаўства і лінгвадыдактыкі ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка”

(пратакол № 10 ад 20.04.2020 г.)

Загадчык кафедры ____________ Д.В. Дзятко

Навукова-метадычным саветам установы адукацыі “Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка”

(пратакол № 5 ад 16.06.2020 г.)

Афармленне вучэбнай праграмы і суправаджальных матэрыялаў дзеючым патрабаванням Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь адпавядае.

Метадыст вучэбна-метадычнага аддзела ____________ С.А. Старадуб

Дырэктар бібліятэкі ____________ Н.П. Сяткоўская

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

**Мэта вучэбнай дысцыпліны “Уводзіны ў славянскую філалогію”** – даць студэнтам пачатковыя веды аб славянскіх народах і іх мовах, пазнаёміць з багатай духоўнай і матэрыяльнай культурай славянскага свету.

**Задачы вучэбнай дысцыпліны “Уводзіны ў славянскую філалогію”:**

– пазнаёміць студэнтаў з лінгва-культуральнай разнастайнасцю славянскага свету і тымі фактарамі, што дазваляюць аб’ядноўваць славянаў у адну этнічную групу;

– сфарміраваць уяўленне аб праславянскай мове, метадах яе рэканструкцыі і гісторыі ўзнікнення славянскай пісьменнасці;

– удасканаліць навыкі крытычнага аналізу найбольш складаных з’яў славянскай філалогіі;

– навучыць будучых настаўнікаў-славеснікаў распазнаваць тэксты на розных славянскіх мовах;

– набыць элементарныя навыкі чытання тэкстаў на стараславянскай і розных славянскіх мовах, а таксама вылучэння ў іх адметных рыс;

– садзейнічаць падрыхтоўцы высокаадукаваных, творчых і крытычна думаючых спецыялістаў, здольных практычна выкарыстоўваць набытыя веды пры вывучэнні спецыяльных мовазнаўчых дысцыплін.

Вучэбная праграма па дысцыпліне “Уводзіны ў славянскую філалогію” прызначана для рэалізацыі на першай ступені вышэйшай адукацыі ў межах цыкла спецыяльных дысцыплін і займае сярод іх важнае месца. Яна знаёміць студэнтаў са станам і напрамкамі развіцця славянскай філалогіі, пачынаючы ад першых упамінанняў пра мову славянаў да навуковых распрацовак айчынных і замежных мовазнаўцаў канца XX – пачатку XXI стст. Веды па славянскай філалогіі неабходныя будучым настаўнікам-філолагам для больш дакладнага разумення шляхоў і спосабаў фарміравання беларускай нацыянальнай мовы, прагназавання яе далейшага развіцця ва ўмовах дзяржаўнага беларуска-рускага двухмоўя. Праз знаёмства са славянскімі мовамі і іх становішчам у сучасным свеце ўдасканальваюцца метады даследавання ў беларусістыцы, дасягаецца большая іх эфектыўнасць і практычнае значэнне. Пры вывучэнні дысцыпліны “Уводзіны ў славянскую філалогію” прадугледжваецца пераемнасць і сувязь яе з такімі лінгвістычнымі дысцыплінамі, як “Беларускае мовазнаўства”, “Гісторыя беларускай мовы”, а таксама са школьным курсам беларускай мовы.

*Месца вучэбнай дысцыпліны ў шэрагу іншых дысцыплін.*“Уводзіны з славянскую філалогію”– вучэбная дысцыпліна, якая мае ярка выражаны міждысцыплінарны характар, што абумоўлена яе аб’ектам даследавання. Славянскія мовы і народы вывучаюцца ў мовазнаўстве, літаратуразнаўстве, гісторыі, што дае магчымасць настаўнікам паспяхова ажыццяўляць міжпрадметныя сувязі.

*Сувязь вучэбнай дысцыпліны з іншымі дысцыплінамі*. Пры вывучэнні вучэбнай дысцыпліны прадугледжваецца пераемнасць і сувязь яго з іншымі лінгвістычнымі дысцыплінамі (гісторыяй беларускай мовы, беларускім моваznaўствам), а таксама са школьным курсам беларускай мовы. Асаблівая ўвага пры выкладанні асобных тэм павінна ўдзяляцца вывучэнню спецыфічных асаблівасцей славянскіх моў. Лекцыйныя і практычныя заняткі, прадугледжаныя вучэбным планам, узаемна звязаны і арганічна дапаўняюць адно аднаго, даючы магчымасць паглыбіць і ўдасканаліць набытыя веды.

Вывучэнне вучэбнай дысцыпліны “Уводзіны ў славянскую філалогію” павінна забяспечыць фарміраванне ў студэнтаў *акадэмічных, сацыяльна-асобасных і прафесійных кампетэнцый*.

***Патрабаванні да акадэмічных кампетэнцый.***

Студэнт павінен:

АК-1 – Умець прымяняць базавыя навукова-тэарэтычныя веды для рашэння тэарэтычных і практычных задач;

АК-4 – Умець працаваць самастойна;

АК-5 – Быць здольным спараджаць новыя ідэі (валодаць крэатыўнасцю);

АК-6 – Валодаць міждысцыплінарным падыходам пры рашэнні праблем;

АК-8 – Валодаць навыкамі вуснай і пісьмовай камунікацыі.

***Патрабаванні да сацыяльна-асобасных кампетэнцый.***

Студэнт павінен:

САК-1 – Валодаць якасцямі грамадзянскасці;

САК-2 – Быць здольным да сацыяльнага ўзаемадзеяння;

САК-3 – Валодаць здольнасцю да міжасобасных камунікацый;

САК-5 – Быць здольным да крытыкі самакрытыкі;

САК-6 – Умець працаваць у камандзе.

***Патрабаванні да прафесійных кампетэнцый.***

Студэнт павінен:

ПК-8 – Фарміраваць базавыя кампаненты культуры асобы навучэнца.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны “Уводзіны ў славянскую філалогію” студэнт павінен ***ведаць***:

– найбольш пашыраныя гіпотэзы паходжання славянаў і месцазнаходжання іх прарадзімы;

– кантакты славянаў у старажытнасці з іншымі еўрапейскімі народамі;

– адметнасці духоўнай і матэрыяльнай культуры славянаў;

– фанетычна-граматычныя і графічныя асаблівасці славянскіх моў, важныя звесткі пра гістарычны лёс іх носьбітаў;

– гісторыю станаўлення славянскай філалогіі;

– сучасную праблематыку славістычнай навукі;

– асноўную навуковую і даведачную літаратуру па дадзенай вучэбнай дысцыпліне.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны “Уводзіны ў славянскую філалогію” студэнт павінен ***умець:***

– адбіраць, аналізаваць і сістэматызаваць моўныя факты;

– праводзіць самастойныя лінгвістычныя назіранні, рабіць абагульненні

і вывады;

– заўважаць агульнае і адметнае ў навуковых фактах пра славянскія мовы;

– карыстацца разнастайнымі славянскімі слоўнікамі, вучэбнымі дапаможнікамі і даведачнай літаратурай;

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны «Уводзіны ў славянскую філалогію» студэнт павінен ***валодаць:***

– сістэмай тэарэтычных ведаў па гісторыі станаўлення і развіцця славянскай філалогіі як навукі, навыкамі гістарычнага аналізу моўнага матэрыялу, практычнага выкарыстання набытых ведаў пры аналізе розных лінгвістычных фактаў;

– уменнем разглядаць сучасныя моўныя факты у іх гістарычнай і прасторавай рэтраспектыве.

У адпаведнасці з вучэбным планам установы адукацыі "Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка" на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны "Уводзіны ў славянскую філалогію" запланавана 64 гадзіны, з іх 34 гадзіны – аўдыторныя заняткі.

Форма атрымання вышэйшай адукацыі – дзённая.

*Размеркаванне гадзін на дзённым аддзяленні:*

| семестр | усяго гадзін | аўдыторныя | лекцыі | практычныя | КСР | | самаст. праца | форма контролю |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | лк | пр | | |
| 5 | 64 | 34 | 22 | 12 | - | - | 30 | **залік** |

## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

**1. Уводзіны**. Паняцце пра славянскую філалогію і яе структуру. Прадмет і задачы славянскай філалогіі. Крыніцы звестак па славянскай філалогіі.

**2. Славянскія народы**. Геаграфічна-гістарычная характарыстыка славянскіх народаў. Сучасны стан славянскіх дзяржаў і народаў. Канфесійная прыналежнасць славянаў.

**3. Праіндаеўрапейская мова**. Індаеўрапейская моўная сям’я. Час і месца існавання праіндаеўрапейскай мовы, яе распад. Тэорыя аб настратычных мовах.

**4. Праславянская мова**. Праславянская мова як адна з індаеўрапейскіх моў, час яе існавання і перыядызацыя. Праіндаеўрапейская фанетычная спадчына і яе трансфармацыя ў праславянскай мове. Праіндаеўрапейская граматычная спадчына і яе трансфармацыя ў праславянскай мове. Развіццё лексічнага фонду праславянскай мовы.

**5. Славянскія мовы**. Агульная характарыстыка славянскіх моў.

*Усходнеславянскія мовы і іх асаблівасці*. Асноўныя звесткі аб узнікненні і развіцці пісьменнасці і гісторыі літаратурных моў усходніх славянаў. Асаблівасці графікі, фанетыкі, лексічнага і граматычнага складу ўсходнеславянскіх моў. Гісторыя навукі пра ўсходнеславянскія мовы.

*Заходнеславянскія мовы*. Асноўныя звесткі аб узнікненні і развіцці пісьменнасці і гісторыі літаратурных моў заходніх славянаў. Асаблівасці графікі, фанетыкі, лексічнага і граматычнага складу заходнеславянскіх моў. Гісторыя навукі пра заходнеславянскія мовы.

*Паўднёваславянскія мовы*. Асноўныя звесткі аб узнікненні і развіцці пісьменнасці і гісторыі літаратурных моў паўднёвых славянаў. Асаблівасці графікі, фанетыкі, лексічнага і граматычнага складу паўднёваславянскіх моў. Гісторыя навукі пра паўднёваславянскія мовы.

**6. Славянскае пісьменства**. Гіпотэзы існавання пісьменства ў славянаў да Кірылы і Мяфодзія. Жыццё і дзейнасць асветнікаў Кірылы і Мяфодзія. Паходжанне славянскіх азбук і пытанне аб іх першаснасці і аўтарстве. Развіццё славянскіх графічных сістэм да нашага часу. Славянскія помнікі пісьменства (надпісы, рукапісы, інкунабулы). Захаванне і выданне старaславянскіх помнікаў пісьменства.

**7. З гісторыі славянскай філалогіі. Славістыка на сучасным этапе**. Заснавальнікі славістыкі: *І. Добраўскі, Е. Капітар, А.Х. Вастокаў, П.Й. Шафарык*. Поспехі славістыкі ў XIX стагоддзі: *А.А. Патабня, А. Шлейхер, Ф. Міклашыч, А. Лескін, І.В. Ягіч, І.А. Бадуэн дэ Куртанэ, Ф.Ф. Фартунатаў*. Славістыка і славісты ў XX стагоддзі: *Р.Ф. Брандт, А.І. Сабалеўскі, Я.Ф. Карскі, А.А. Шахматаў, М.Н. Сяпранскі, І.Я. Франко, І.С. Свянціцкі, Я.М. Развадоўскі, Л. Нідэрле, А.І. Беліч, М.М. Петэрсан, Л.У. Шчэрба, А.М. Сяліщчаў, Л.А. Булахоўскі, П.А. Бузук, Б. Гаўранек, Р.В. Якабсон, М.С.*

*Трубяцкі, Ц.П. Ломцеў, В.У. Іваноў.* Славістыка на сучасным этапе. Актуальныя задачы сучаснай славістыкі.

## Вучэбна-метадычная карта вучэбнай дысцыпліны
## (дзённая форма атрымання вышэйшай адукацыі)

| № раздзела, тэмы | Назва раздзела, тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | Самастойная работа | Літаратура | Форма кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | лекцыйныя | практычныя | | | |
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 |
| | **Уводзіны ў славянскую філалогію (34 г.)** | **22** | **12** | **30** | | |
| **1.** | **Уводзіны** | **2** | | **2** | | |
| 1.1. | 1. Паняцце пра славянскую філалогію і яе структуру.<br>2. Прадмет і задачы славянскай філалогіі. Крыніцы звестак па славянскай філалогіі. | 2 | | 2 | 1,2,5 | |
| **2.** | **Славянскія народы** | **2** | | **2** | 1,2 | |
| 2.1. | 1. Геаграфічна-гістарычная характарыстыка славянскіх народаў.<br>2. Канфесійная прыналежнасць славянаў. | 2 | | 2 | 1,2 | |
| **3.** | **Праіндаеўрапейская мова** | **2** | | **2** | | |
| 3.1. | 1. Індаеўрапейская моўная сям’я.<br>2. Час і месца існавання праіндаеўрапейскай мовы, яе распад.<br>3. Тэорыя аб настратычных мовах. | 2 | | 2 | 1,2 | |
| **4.** | **Праславянская мова** | **2** | **2** | **2** | | |
| 4.1. | 1. Праславянская мова як адна з індаеўрапейскіх моў, час яе існавання і перыядызацыя.<br>2. Праіндаеўрапейская фанетычная спадчына і яе трансфармацыя ў праславянскай мове. | 2 | | 2 | 1,5 | |
| 4.2 | 1. Праіндаеўрапейская граматычная спадчына і яе трансфармацыя ў праславянскай мове.<br>2. Развіццё лексічнага фонду праславянскай мовы. | | 2 | | 1,2 | Франтальнае апытванне. Прэзентацыя. |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| **5.** | **Славянскія мовы** | **10** | **6** | **12** | | |
| 5.1. | 1. Агульная характарыстыка славянскіх моў.<br>2. Усходнеславянскія мовы і іх асаблівасці.<br>3. Асаблівасці графікі, фанетыкі, лексічнага і граматычнага складу ўсходнеславянскіх моў.<br>4. Гісторыя навукі пра ўсходнеславянскія мовы. | 2 | | | 1,2,3 | |
| 5.2 | *Славянскія мовы*<br>1.Асноўныя звесткі аб узнікненні і развіцці пісьменнасці і гісторыі літаратурных моў усходніх славянаў. | | 2 | 4 | 1,2 | Франтальнае апытванне. Прэзентацыя. |
| 5.3. | *Заходнеславянскія мовы.*<br>1. Асноўныя звесткі аб узнікненні і развіцці пісьменнасці і гісторыі літаратурных моў заходніх славянаў. | 2 | | 4 | 1,3 | |
| 5.4. | 1. Асаблівасці графікі, фанетыкі, лексічнага і граматычнага складу заходнеславянскіх моў. | 2 | | | 1,2 | |
| 5.5. | 1. Гісторыя навукі пра заходнеславянскія мовы. | | 2 | | 1,4 | Франтальнае апытванне. Прэзентацыя. |
| 5.6. | *Паўднёваславянскія мовы*.<br>1. Аасноўныя звесткі аб узнікненні і развіцці пісьменнасці і гісторыі літаратурных моў паўднёвых славянаў. | 2 | | 4 | 1,2 | |
| 5.7. | 1. Асаблівасці графікі, фанетыкі, лексічнага і граматычнага складу паўднёваславянскіх моў. | 2 | | | 1,2 | |
| 5.8 | 2. Гісторыя навукі пра паўднёваславянскія мовы. | | 2 | | | Індывідуальнае апытванне. |
| **6.** | **Славянскае пісьменства** | **2** | **2** | **4** | | |
| 6.1. | 1. Гіпотэзы існавання пісьменства ў славянаў да Кірылы і Мяфодзія.<br>2. Жыццё і дзейнасць асветнікаў Кірылы і Мяфодзія.<br>3. Паходжанне славянскіх азбук і пытанне аб іх першаснасці і аўтарстве. | 2 | | 4 | 1,5 | |
| 6.2. | 1. Развіццё славянскіх графічных сістэм да нашага часу.<br>2. Славянскія помнікі пісьменства (надпісы, рукапісы, інкунабулы).<br>3. Захаванне і выданне стараславянскіх помнікаў пісьменства. | | 2 | | 1,2 | Франтальнае апытванне. Прэзентацыя |
| **7.** | **З гісторыі славянскай філалогіі. Славістыка на сучасным этапе** | **2** | **2** | **6** | | |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 7.1. | 1. Заснавальнікі славістыкі: *І. Добраўскі, Е. Капітар, А.Х. Вастокаў, П.Й. Шафарык*.<br>2. Поспехі славістыкі ў XIX стагоддзі: *А.А. Патабня, А. Шлейхер, Ф. Міклашыч, А. Лескін, І.В. Ягіч, І.А. Бадуэн дэ Куртанэ, Ф.Ф. Фартунатаў*. | 2 | | 6 | 1,2 | |
| 7.2. | **З гісторыі славянскай філалогіі. Славістыка на сучасным этапе.**<br>3. Славістыка і славісты ў XX стагоддзі: Р.Ф. Брандт, А.І. Сабалеўскі, Я.Ф. Карскі, А.А. Шахматаў, М.Н. Спяранскі, І.Я. Франко, І.С. Свянціцкі, Я.М. Развадоўскі, Л. Нідэрле, А.І. Беліч, М.М. Петэрсан, Л.У. Шчэрба, А.М. Сялішчаў, Л.А. Булахоўскі, П.А. Бузук, Б. Гаўранек, Р.В. Якабсон, М.С. Трубяцкі, Ц.П. Ломцеў, В.У. Іваноў.<br>4. Актуальныя задачы сучаснай славістыкі | | 2 | | 1,2 | Індывідуальнае апытванне. |
| | **Усяго** | **22** | **12** | **30** | | |

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## ЛІТАРАТУРА

**Асноўная літаратура**

1. Камлевич, Г. А. Введение в славянскую филологию [Электронный ресурс] : учеб.-метод. комплек / Г. А. Камлевич // Репозиторий БГПУ. – Режим доступа: http://elib.bspu.by/handle/doc/2146. – Дата доступа: 08.06.2020.
2. Камлевич, Г. А. Введение в славянскую филологию [Электронный ресурс] : практикум / Г. А. Камлевич // Репозиторий БГПУ. – Режим доступа: http://elib.bspu.by/handle/doc/618. – Дата доступа: 08.06.2020.

**Дадатковая літаратура**

1. Багдзевіч, А. І. Уводзіны ў славянскую філалогію / А. І. Багдзевіч, С. Г. Ляскевіч. – Гродна : Гродзен. дзярж. ун-т, 2011. – 274 с.
2. Булахов, М. Г. Славянские языки: происхождение, история, современное состояние / М. Г. Булахов. – Минск : Белорус. гос. пед. ун-т, 2001. – 225 с.
3. Дуличенко, А. Д. Введение в славянскую филологию / А. Д. Дуличенко. – М. : Флинта, 2014. – 720 с.
4. Минералов, Ю. М. Введение в славянскую филологию / Ю. М. Минералов. – М. : Высш. школа, 2009. – 331 с.
5. Рагаўцоў, В. І. Гісторыя мовазнаўства / В. І. Рагаўцоў. – Магілёў : Магілеўс. дзярж. ун-т, 2005. – 496 с.
6. Соколянский, А. А. Введение в славянскую филологию / А. А. Соколянский. – М. : Академия, 2004. – 400 с.
7. Супрун, А. Е. Введение в славянскую филологию / А. Е. Супрун. – Минск : Выш. шк., 1989. – 480 с.
8. Трубачев, О. Н. Этногенез и культура древнейших славян: лингвистические исследования / О. Н. Трубачев. – М. : Наука, 2003. – 495 с.
9. Цыхун, Г. А. Выбраныя працы: беларусістыка, славістыка, арэальная лінгвістыка / Г. А. Цыхун. – Мінск : Рэсп. ін-т выш. шк., 2012. – 372 с.
10. Шушарина, И. А. Введение в славянскую филологию / И. А. Шушарина. – М. : Флинта : Наука, 2011. – 302 с.
11. Щеглова, О. Г. Введение в славянскую филологию / О. Г. Щеглова. – Новосибирск : Новосиб. гос. ун-т, 2013. – 126 с.
12. Языки мира. Славянские языки / А. М. Молдован [и др.] ; под ред. А. М. Молдован – СПб. : Нестор-История, 2017. – 680 с.

# МЕТАДЫЧНЫЯ РЭКАМЕНДАЦЫІ ПА АРГАНІЗАЦЫІ І ВЫКАНАННІ САМАСТОЙНАЙ ПРАЦЫ ПА ДЫСЦЫПЛІНЕ «УВОДЗІНЫ Ў СЛАВЯНСКУЮ ФІЛАЛОГІЮ»

Для павышэння якасці прафесійнай падрыхтоўкі будучых настаўнікаў мэтазгодна на працягу ўсяго тэрміну навучання ў ВНУ прыцягваць кожнага студэнта да сістэматычнай самастойнай работы. Змест і формы самастойнай работы студэнтаў распрацоўваюцца супрацоўнікамі кафедры ў адпаведнасці з мэтамі і задачамі адукацыйнага стандарту.

Матэрыял, рэкамендаваны для самастойнага вывучэння, студэнты павінны атрымліваць ад выкладчыка з першых тыдняў семестра. Матэрыял для самастойнай працы, распрацаваны выкладчыкамі кафедры, можа ўключаць комплексы індывідуальных заданняў па пэўных тэмах, сістэму індывідуальных дамашніх кантрольных работ па тэмах і раздзелах дысцыпліны.

На самастойнае вывучэнне варта прапаноўваць асобныя тэмы лекцый або іх часткі па раней складзеным плане з указаннем асноўнай і дадатковай літаратуры па праблеме.

Эфектыўнасць самастойнай працы студэнтаў залежыць ад многіх фактараў. Тут і аптымальна выбраная форма працы, і дакладныя, канкрэтныя ўказанні і рэкамендацыі выкладчыка з наступнай аб’ектыўнай ацэнкай яе вынікаў і, самае важнае, сістэматычнасць і паслядоўнасць у правядзенні такой працы.

Самастойная работа студэнтаў прадугледжвае выкананне кантрольных прац, тэстаў, падрыхтоўку вусных паведамленняў і пісьмовых рэфератаў па вызначанай тэматыцы, знаёмства з навуковай, навукова-папулярнай, хрэстаматыйнай літаратурай, з тэрміналагічнымі слоўнікамі, пераклад, рэферыраванне і анатаванне прафесійна арыентаваных тэкстаў і інш.

Самастойная работа студэнтаў праводзіцца ў аб’ёме, прадугледжаным вучэбным планам.

| **п/п** | **Назва тэмы, раздзела** | **Коль-касць гадзін на СПС** | **Заданне** | **Форма выканання** |
|---|---|---|---|---|
| **1.1.** | Прадмет і задачы славянскай філалогіі. Крыніцы звестак па славянскай філалогіі. | 2 | Падрыхтаваць канспект пра мэты і задачы курса, пра асноўныя крыніцы звестак пра славянскую філалогію | Канспект |
| **2.1.** | Геаграфічна-гістарычная характарыстыка славянскіх народаў. | 2 | Падрыхтаваць партфоліа, дзе будуць праілюстравана геаграфічна-гістарычная характарыстыка славянскіх народаў, іх сучасны стан, канфесійная | Прэзентацыя |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | | | прыналежнасць славянаў. | |
| **3.1.** | Індаеўрапейская моўная сям’я. | 2 | Падрыхтаваць прэзентацыю па тэме «Індаеўрапейская моўная сям’я. Час і месца існавання праіндаеўрапейскай мовы, яе распад. Тэорыя аб настратычных мовах». | Прэзентацыя |
| **4.1.** | Праславянская мова як адна з індаеўрапейскіх моў, час яе існавання і перыядызацыя. | 2 | Сабраць і скапіраваць фрагменты прац па тэмах «Праславянская мова як адна з індаеўрапейскіх моў, час яе існавання і перыядызацыя», «Праіндаеўрапейская фанетычная спадчына і яе трансфармацыя ў праславянскай мове», «Праіндаеўрапейская граматычная спадчына і яе трансфармацыя ў праславянскай мове», «Развіццё лексічнага фонду праславянскай мовы». | Картатэка моўных фактаў; рэферат |
| **5.2.** | Асноўныя звесткі аб узнікненні і развіцці пісьменнасці і гісторыі літаратурных моў усходніх славянаў. | 4 | Правесці аналіз матэрыялаў па тэмах «Агульная характарыстыка славянскіх моў», «Усходнеславянскія мовы і іх асаблівасці», «Асноўныя звесткі аб узнікненні і развіцці пісьменнасці і гісторыі літаратурных моў усходніх славянаў». | Даклад |
| **5.3.** | Асноўныя звесткі аб узнікненні і развіцці пісьменнасці і гісторыі літаратурных моў заходніх славянаў.. | 4 | Падрыхтаваць рэферат па тэмах . «Заходнеславянскія мовы», «Асноўныя звесткі аб узнікненні і развіцці пісьменнасці і гісторыі літаратурных моў заходніх славянаў». | Картатэка моўных фактаў; рэферат. |
| **5.6.** | Аасноўныя звесткі аб узнікненні і развіцці пісьменнасці і гісторыі літаратурных моў паўднёвых славянаў. | 4 | Падрыхтаваць прэзентацыі па тэмах: «Асаблівасці паўдневаславянскіх моў», «Аасноўныя звесткі аб узнікненні і развіцці пісьменнасці і гісторыі літаратурных моў паўднёвых славянаў». | Рэферат |
| **6.1.** | Гіпотэзы існавання пісьменства ў славянаў да | 4 | Падрыхтаваць прэзентацыі па тэмах: | Прэзентацыя |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | Кірылы і Мяфодзія. | | «Жыццё і дзейнасць асветнікаў Кірылы і Мяфодзія», «Паходжанне славянскіх азбук і пытанне аб іх першаснасці і аўтарстве», «Развіццё славянскіх графічных сістэм да нашага часу», «Славянскія помнікі пісьменства (надпісы, рукапісы, інкунабулы)», «Захаванне і выданне стараславянскіх помнікаў пісьменства». | |
| **7.1.** | Заснавальнікі славістыкі: *І. Добраўскі, Е. Капітар, А.Х. Востокаў, П.Й. Шафарык.* | 6 | Падрыхтаваць рэферат і прэзентацыі па тэмах: «Заснавальнікі славістыкі: Добраўскі, Е. Капітар, А.Х. Востокаў, П.Й. Шафарык», «Поспехі славістыкі ў XIX стагоддзі: А.А. Патабня, А. Шлейхер, Ф. Міклашыч, А. Лескін, І.В. Ягіч, І.А. Бадуэн дэ Куртанэ, Ф.Ф. Фартунатаў», «Славістыка і славісты ў XX стагоддзі: Р.Ф. Брандт, А.І. Сабалеўскі, Я.Ф. Карскі, А.А. Шахматаў, М.Н. Спяранскі, І.Я. Франко, І.С. Свянціцкі, Я.М. Развадоўскі, Л. Нідэрле, А.І. Беліч, М.М. Петэрсан, Л.У. Шчэрба, А.М. Сялішчаў, Л.А. Булахоўскі, П.А. Бузук, Б. Гаўранек, Р.В. Якабсон, М.С. Трубяцкі, Ц.П. Ломцеў, В.У. Іваноў», «Актуальныя задачы сучаснай славістыкі». | Рэферат |

# АПІСАННЕ СРОДКАЎ ДЫЯГНОСТЫКІ

Для атрымання аб’ектыўнай інфармацыі аб ўзроўні паспяховасці студэнтаў мэтазгодна сістэматычна выкарыстоўваць розныя віды кантролю, сярод якіх: бягучы, тэматычны, прамежкавы і выніковы. Кожны з відаў кантролю ўжываецца на пэўным этапе навучання і выконвае ў педагагічным працэсе адну з функцый: стымулюючую, навучальную, дыягнастычную, выхаваўчую і інш.

Дыягностыка кампетэнцый па дысцыпліне можа мець розныя формы: вусны кантроль – франтальнае, індывідуальнае, ушчыльненае (камбінаванае) апытванне на лекцыях і практычных занятках; калёквіумы; вусны аналіз тэксту стараславянскага пісьменства, а таксама тэксту на адной з сучасных славянскіх моў; вусны залік.

# ПЕРАЛІК ТЭАРЭТЫЧНЫХ ПЫТАННЯЎ ДА ЗАЛІКУ ПА ДЫСЦЫПЛІНЕ «УВОДЗІНЫ Ў СЛАВЯНСКУЮ ФІЛАЛОГІЮ»

1. Прадмет і задачы славянскай філалогіі. Крыніцы звестак па славянскай філалогіі, яе сувязь з іншымі гуманітарнымі навукамі.
2. Славяне і славянскія мовы.
3. Час і месца існавання праіндаеўрапейскай мовы, яе распад.
4. Праславянская мова, час яе існавання і перыядызацыя.
5. Развіццё лексічнага фонду праславянскай мовы.
6. Першыя звесткі пра славянаў. Паходжанне этноніма. Міжэтнічныя і міжмоўныя кантакты ў праславянскі перыяд.
7. Час і месца фарміравання славянаў. Арэал пражывання славянаў.
8. Лінгвістычны аспект праблематыкі славянскай прарадзімы. Сучасныя тэорыі славянскай прарадзімы.
9. Агульная характарыстыка славянскіх моў.
10. Гісторыя стварэння славянскага пісьменства.
11. Канстанцін (Кірыл) і Мяфодзій і славянскае пісьменства.
12. Паходжанне глаголіцы і кірыліцы. Параўнальны аналіз азбук.
13. Славянскія помнікі пісьменнасці: надпісы.
14. Славянскія помнікі пісьменнасці: рукапісы.
15. Славянскія помнікі пісьменнасці: інкунабулы.
16. Помнікі старaславянскай мовы.
17. Асаблівасці ўсходнеславянскіх моў: беларуская мова.
18. Асаблівасці ўсходнеславянскіх моў: руская мова.
19. Асаблівасці ўсходнеславянскіх моў: украінская мова.
20. Асаблівасці заходнеславянскіх моў: польская мова.
21. Асаблівасці заходнеславянскіх моў: сербалужыцкія мовы.
22. Асаблівасці заходнеславянскіх моў: чэшская мова.
23. Асаблівасці заходнеславянскіх моў: славацкая мова.
24. Асаблівасці паўднёваславянскіх моў: балгарская мова.
25. Асаблівасці паўднёваславянскіх моў: македонская мова.
26. Асаблівасці паўднёваславянскіх моў: сербская мова.
27. Асаблівасці паўднёваславянскіх моў: харвацкая мова.
28. Асаблівасці паўднёваславянскіх моў: славенская мова.
29. З гісторыі славянскай філалогіі: славістыка ў ХІХ стагоддзі.
30. З гісторыі славянскай філалогіі: славістыка канца ХІХ – пачатку ХХ стагоддзя.
31. З гісторыі славянскай філалогіі: славістыка ў ХХ стагоддзі.
32. Славістыка на сучасным этапе. Актуальныя задачы славістыкі.

# ПРАТАКОЛ УЗГАДНЕННЯ ВУЧЭБНАЙ ПРАГРАМЫ УВА

| **Назва вучэбнай дысцыпліны, з якой патрабуецца ўзгадненне** | **Назва кафедры** | **Прапановы аб зменах у змесце вучэбнай праграмы ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне** | **Рашэнне, прынятае кафедрай, што распрацавала вучэбную праграму** |
|---|---|---|---|
| Беларускае мовазнаўства | мовазнаўства і лінгвадыдактыкі | няма | Пратакол № 10 ад 20.04.2020 г. |
| Гісторыя беларускай мовы | мовазнаўства і лінгвадыдактыкі | няма | Пратакол № 10 ад 20.04.2020 г. |